# Вусны альманах «Сілуэты продкаў»

**Н. Ф. Ждан,**
бібліятэкар першай катэгорыі
Лідскага дзяржаўнага прафесійнага політэхнічнага ліцэя

***Профиль музея:*** сбор экспонатов по истории Лидского ГППЛ; этнографический, краеведческий.

***Название музея*** – историко-краеведческий музей «Вытокі».

***Дата открытия музея*** – 8 апреля 2005 года

площадь музейной комнаты – 43,8 м2;

количество экспонатов основного фонда – 463;

количество экспонатов научно-вспомогательного фонда – 240.

***Концепция музея***: историко-краеведческий музей «Вытокі» является частью образовательной и воспитательной системы учреждения образования, центром патриотического и духовно – нравственного воспитания, средством развития личности подростка.

***Цель:*** формирование патриотизма и гражданственности через организацию просветительской и поисково-исследовательской работы, воспитание достойных продолжателей лучших рабочих традиций

***Задачи:***

- поиск и отбор предметов, представляющих историческую и культурную ценность;
- поиск и исследование источников краеведческого характера;
- публикация материалов о предметах и коллекциях, являющихся частью музейных экспозиций;
- создание современного коммуникационного пространства через деятельность виртуального музея «Времена»

- организация и проведение мероприятий, содействующих гражданско-патриотическому и духовному развитию обучающихся.

***Аннотация разделов экспозиции:***

I раздел – «Мой лицей – моя Alma mater» содержит материалы по истории создания и развития Лидского ГППЛ (образцы продукции, спортивные кубки, дипломы, грамоты, альбомы о выпускниках, 3 стенда с фотографиями).

II раздел – этнографический "Беларускае падвор'е". В нём размещены орудия труда белорусского крестьянина, домашняя утварь, предметы национальной одежды, обуви, произведения прикладного мастерства (вышивка, ткачество, соломка).

III раздел – краеведческий "Мой горад". Включает в свою экспозицию 4 стенда (этапы развития г. Лида).

В числе экспонатов: материальные предметы с археологических раскопок Лидского замка; иллюстрации гербов г. Лида, документы (паспорта, партийные и комсомольские билеты), фотоснимки, портреты выдающихся земляков; орудия труда лидских ремесленников; предметы домашнего быта.

IY раздел – «Это нужно живым». Включает в себя 3 стенда (основные вехи войны), документы, фото и награды ветеранов; материальные свидетели войны (штык-ножи, обезвреженные пули, гранаты и т.п.); бытовые предметы немецких и советских солдат; фотографии.

***Формы работы музея:***

- исследовательская работа кружков «Спадчына», «Патриот»;
- экскурсии по следующим темам: «Ад прадзедаў спакон вякоў нам дасталася спадчына»; «Мой лицей - моя alma mater», виртуальная экскурсия «Лида: эхо столетий»,
- сбор экспонатов;

- пополнение научно-вспомогательного фонда (оформление альбомов: «Мастера Лидского ГППЛ», «Преподаватели Лидского ГППЛ»);
- классные часы “Сілуэты продкаў”; “Спадчына нашых дзядоў”(беларускія традыцыі, абрады, рамёствы), “Мова – душа народа”, “Спасибо солдатам Победы за то, что не знаем войны”;
- встречи с выдающимися земляками

***Перспективы развития музея:***

- использование инновационных форм работы в деятельности музея;
- установление и развитие связей с другими музеями,
- привлечение родителей к работе в музее;
- пополнение фонда, цельная поисковая работа краеведческой направленности с целью присвоения звания "Народный музей"

**Сілуэты продкаў**

Дзе прайшло дзяцінтсва, там пачынаецца Радзіма

Кузьма Чорны

Аўтар**:** бібліятэкар першай катэгорыі установы адукацыі «Лідскі дзяржаўны прафесійны політэчнічны ліцэй» Ждан Наталля Фёдараўна

2022 год аб’яўлены Годам гістарычнай памяці. Але няма і не можа быць гісторыі без людзей, без асобы. Адчуванне сябе часцінкай вялікага народа ў немалой ступені залежыць ад ведання таго, кім былі твае продкі.

Міхайла Ламаносаў некалі заўважыў: “Народ, які не ведае свайго мінулага, не мае будучыні”. Гэта менавіта так і ёсць.

Прапануем успомніць знакамітых людзей Гродзеншчыны, якія пакінулі яркі адбітак у гісторыі, навуцы і культурнай спадчыне свету. Менавіта з ведання імёнаў знакамітых людзей, іх укладзе ў сусветную скарбонку і

складаецца гістарычная спадчына нашай краіны і нашага народа, фармуецца пачуццё павагі і гонару да радзімы.

**Форма правядзення**: вусны музейны альманах

- першая старонка"Люблю мой край" (аб гістарычным мінулым краю)
- другая старонка "Навукоўцы Гродзеншчыны"
- трэцяя старонка "Культурная спадчына"
- чацвёртая "Мы – нашчадкі"

**Мэта**: выхаванне патрыятызму ў падлеткаў, прапаганда гуманістычных каштоўнасцёў

**Задачы:**

- азнаёміць падлеткаў з гістарычнай і культурнай спадчыны нашай Радзімы і, у тым ліку, Прынёманскага краю; падштурхнуць да вывучэння гісторыі свайго роду, сваіх каранёў;
- стварыць падставы для таго, каб нашы дзеці з гонарам вымаўлялі "Я – беларус", адчуваючы сябе прадстаўніком вялікага народа;
- абудзіць у падлеткаў пачуццё сваёй этнакультурнай непаўторнасці і нацыянальную свядомасць, якая б выяўлялася ў іх дакладнай грамадзянскай пазіцыі;
- садзейнічаць развіццю чалавека - творцы, які стварае свой свет на падставе дасягненняў мінулага.

**Афармленне** гістарычнай экспазіцыі музея: партрэты славутых людзей Прынёманскага краю, выстава літаратуры аб іх жыцці і дзейнасці

**Ход мерапрыемства:**

**Вядучы**: Паважаныя сябры, дазвольце адкрыць наш альманах над назвай "Сілуэты продкаў"

Сёлетні год аб'яўлены Годам гістарычнай памяці. Але няма і не можа быць гісторыі без людзей, без асобы.

Адчуванне сябе часцінкай вялікага народа ў немалой ступені залежыць ад ведання таго, кім былі твае продкі.

Кожная дзяржава мае свае нацыянальныя знакі і адрозненні, якія з'яўляюцца падставай для гонару. Гэта звычаі і традыцыі, рысы характару і погляды на свет. Гэта людзі, якія нарадзіліся на гэтай зямлі і ўславілі яе сваімі ўчынкамі і сваім жыццём.

Беларусы таксама ў розныя часы здзейснілі подзвіг у імя навукі, пакінулі свае сляды ў культуры не толькі нашай радзімы, але і далёка за яе межамі.

**Вядучы:** Давайце ж і мы ўслед за Мікалаем Гумілёвым спытаем у сябе: "Калі ж беларусы, якія так шмат і шчодра раздавалі чалавецтву, пачнуць збіраць?" Паспрабуем збіраць?

Сярод прадстаўнікіоў нашага народа ёсць Нобелеўскія лаўрэаты, і адкрывальнікі універсальных законаў прыроды, вядомыя акцёры і мастакі, славутыя пісьменнікі і паэты.

Выхадцамі з Беларусі былі многія слынныя людзі: палітыкі Мікола Судзілоўскі і Хаім Вейцман; навукоўцы Ота Шмідт, Павел Сухі, Аляксандр Чыжэўскі. Даследчык акіяна, вялікі Жак Іў Кусто мае беларускія карані. Можна прыгадаць імёны пісьменнікаў (Фёдар Дастаеўскі, Яўген Яўтушэнка, Айзек Азімаў, Гіём Апалінэр), геніяльных мастакоў (Іван Хруцкі, Марк Шагал, Леў Бакст), музыкантаў (І. Берлін, А. Макарэвіч), вядомых рэжысёраў і акцёраў (П. Алейнікаў, А. Дзядзюшка), у тым ліку і Галівуда (С. Спілберг, браты Дугласы, Х. Форд), якія паходзілі з беларускай зямлі.

**Вядучы:** Вельмі цікава ўзгадаць, што менавіта наша з вамі зямлячка Алена Глінская, продкі якой валодалі землямі на Лідчыне яшчэ пры Ягелонах, нарадзіла 7 верасня 1530 першага цара зямлі рускай Івана Грознага і ўвяла ў абарачэнне разменную манету – капейку, якая, змяняючы аблічча, дажыла да сёняшнега дня.

Ёсць беларусы, якія і сёння зрабілі важкі ўклад у сусветную навуку і культуру. Вось некалькі імёнаў сёняшняй Беларусі: вучоны Жарэс Алфёраў - лаўрэат Нобелеўскай прэміі 2000 года; мастак Гаўрыла Вашчанка, якому

Міжнародным Біяграфічным цэнтрам нададзена званне “Чалавек XX стагоддзя”, славуты рэжысёр Уладзимір Матыль, аўтар такога шэдэўра кіно, як “Белае сонца пустыні”.

**Вядучы:** Нізанку імёнаў можна доўжыць і доўжыць. Але давайце наблізімся да нашай радзімай зямелькі, што завецца Прынёманскім краем.

*Гучыць песня на вершы Канстанцыі Буйло " Люблю мой край"*

**Чытальнік:**

Цудоўны край наш! У прыволлі
Гамоніць Нёман між лугоў.
Дубы-асілкі ў наваколлі.
Вартуюць тайны курганоў.
О, край наш родны! Край герояў!
Край ніў бязмежных і лугоў.
Край рэк люстраных і азёраў,
Край слаўных дочак і сыноў.

**Вядучы:** (*на фоне карты Гродзеншчыны*) “Ой, Нёман, ой, бацька наш родны”… Асаблівым сэнсам напоўнены для гродненцаў словы гэтай песні. Здаўна рака гэта была для іх карміцелькай, калыскаю і песняй.

Прынёманне – так называюць сваю прыгожую зямлю жыхары Гродзеншчыны. І нездарма. Блакітнай стужкай з усхода на захад у’ецца па яе зямлі прыгажун Нёман – трэцяя па велічыне рака Беларусі, звязваючы ў адно цэлае амаль усе адміністратыўныя раёны Гродзеншчыны.

На Беларусі звыш дваццаці тысяч рэк, але адзін толькі Нёман нарадзіўся пад блакітным беларускім небам.

Бацька Нёман і яго шматлікія дочкі-прытокі збіраюць паўнаводную даніну з магутных дубраў Налібокскай пушчы і светлых азёр пушчы Гродзенскай, з узгоркаў навагрудскіх і запаветных бароў Белавежы.

У Прынёманні няма экзатычных ланшафтаў, але край гэты непаўторны сваёй ціхай, някідкай прыгажосцю. Гродзеншчына – край простай, чароўнай прыроды, край цікавай і павучальнай гісторыі, край, багаты гістарычнымі і культурнымі помнікамі.

У кнізе пад назвай “Беларусь” Прынёманне - адна з найцікавейшых і яскравых старонак.

**Вядучы:** Першыя помнікі старажытнай культуры на Гродзеншчыне пакрыты смугой тысячагоддзяў. Аб нялёгкім жыцці нашых продкаў нагадваюць сёння прымітыўныя прылады працы, гліняныя чарапкі ды крэмневыя шахты.... Але пройдуць яшчэ гады і стагоддзі, нёманцы будуць упарта ісці насустрач цывілізацыі, пакуль аб іх успомняць пісьменныя крыніцы.

Іпацьеўскі летапіс упершыню зафіксаваў для гісторыі год 1128. Гэты год лічыцца годам заснавання Гродна. Праз стагоддзе з чвэрцю летапісныя крыніцы ўжо называюць нашчадкам Навагрудак, Слонім, Ваўкавыск (*запальваюцца агеньчыкамі на карце*), а ў 1323 годзе пры вялікім князе Гедыміне пачалося будаўніцтва Лідскага мураванага замка - кастэля.

У далёкім мінулым край гэты не аднойчы падвяргаўся знішчальным нашэсцям іншаземных захопнікаў, станавіўся арэнай жорсткіх бітваў. Феадалы і манархі дзялілі і перакройвалі гэты край, мянялі дзяржаўную належнасць. Але непакорлівыя жыхары Прынёмання заўсёды імкнуліся да свабоды і не аднойчы са зброяй у руках падымаліся супраць прыгнятальнікаў і ворагаў.

**Вядучы:** Аб былых падзеях барацьбы сведчаць помнікі і імёны, якія Гродзеншчына данесла да сваіх нашчадкаў: Давід Гарадзенскі і Кастусь Каліноўскі, Баляслаў Калышка і Дзімтрый Карбышаў і шмат іншых імёнаў герояў.

**Вядучы:** З Прынёманнем звязаны імёны многіх навукоўцаў і даследчыкаў, дзейнасць і працы якіх складаюць скарб сусветнай навукі. Таму давайце адкрыем наступную старонку альманаха **“Навукоўцы Гродзеншчыны”.**

**Апавядальнік**: У фальварку Яшнец Лідскага павета нарадзіўся, вырас і доўгі час працаваў сумленны грамадзянін сваёй Бацькаўшчыны, адметны філосаф эпохі Асветы **Казімір Даніэль Нарбут**.

З 1784 па 1786 год К. Нарбут узгаўляў Фарны касцёл у Лідзе. Менавіта ў гэты перыяд вучоны піша свае працы па філасофіі, уключаецца ў барацьбу с сярэдневекавой схаластыкай.

Праз некалі гадоў К. Нарбут прызначаецца канцлерам Чартарыйскім членам Адукацыйнай камісіі - першым ў Еўропе Міністэрстве адукацыі - і займаецца складаннем падручнікаў.

Педагагічныя погляды К.Нарбута грунтаваліся на гуманістычных ідэях перыяда ранняй Асветы. Ён быў непахісным прыхільнікам усвядомленнага ўспрымання матэрыяла вучнямі. У сваёй знакамітай "Логіцы" ён пісаў, што настаўнікі, якія "прымушаюць вучняў слепа прытрымлівацца сваіх поглядаў і не дазваляюць разумна карыстацца свабодай меркавання, закоўваюць разум іх у ланцугі".

У Еўропе другой паловы XVIII стагоддзя працягвае заставацца ў цэнтры ўвагі вучэнне Каперніка, забароненае царквой з 1616 года. Ужо гарэлі кастры інквізіцыі, якія паглацілі мільёны жыццяў не толькі вучоных і мысліцеляў, але і простых людзей. Ужо былі спалены Джардана Бруна і наш зямляк Казімір Лышчынскі.... Але выдатны вучоны К. Нарбут усё ж працягвае адстойваць погляды Каперніка, Галілея і Кеплера. У тыя часы гэта быў вельмі мужны ўчынак.

Імя нашага славутага земляка займае асабістае месца сярод мысліцеляў эпохі Асветы. Эстафету яго ідэй і поглядаў падхапілі прафесар філасофіі і логікі Віленскага ўніверсітэта, нараджэнец Беларусі Аніёл Даўгірд, прафесары Віленскага ўніверсітэта юрыст Ігнацій Даніловіч і вучоны-батанік Станіслаў Баніфацый Юндзіл.

Пасля трэццяга падзелу Рэчы Паспалітай вярнуўся ў Беларусь, у вёсачку Радзівонішкі Лідскага павета, дзе і памёр 17 сакавіка 1807 года.

**Апавядальнік:** Сярод нашых славутых землякоў зоркай першай велічыні ззяе імя **Станіслава Баніфацыя Юндзіла**, доктара філасофіі і тэалогіі, прафесара батанікі і заалогіі Віленскага універсітэта, загадчыка кафедры гісторыі прыроды. Вучоны-батанік, заснавальнік універсітэтскага сада ў

Вільні Станіслаў Баніфацый Юндзіл, які адзін з першых прыступіў да даследвання расліннасці Беларусі.

Нарадзіўся Станіслаў Баніфацый ў вёсці Ясенцы Лідскага павета 6 мая 1761 года.

Адной з найбольш значных прац вучонага было "Апісанне літоўскіх раслін паводле сістэмы Лінэя", за якую ён быў узнагароджаны залатым медалём "Merentibus"(быў першым, хто атрымаў такую ўзнагароду). Кніга была на той час адзінай працай, дзе даволі глыбока і дасканала быў апісаны раслінны свет нашай краіны.

**Апавядальнік:** Беларускім Карамзіным называюць сучасныя гісторыкі **Тэадора Нарбута**. Гэта ўдзячнасць за створаную ім 10-томную "Старажытную гісторыю літоўскага народа".

Нарадзіўся ён у фальварку Шаўры Лідскага павета ў 1784 годзе.

Выхаванец Віленскага універсітэта і Пецярбургскай інжынернай акадэміі Т. Нарбут, яшчэ маладым інжынерам браў удзел у рабоце камісіі па ўрэгуляванню рэчышча Нёмана. Ён жа праектаваў розныя ваенна-інжынерныя збудаванні. Менавіта ён з'яўляецца аўтарам праекта Бабруйскай крэпасці, аб якой пазней так пісаў у сваёй кнізе "Героі Айчыннай вайны" генерал-маёр А. Міхайлоўскі: "Ні адна крэпасць у Расіі ніколі не была настолькі карыснай, як Бабруйская ў 1812 годзе".

Калі скончылася служба ў Расійскай арміі, інжынерныя здольнасці Нарбута спатрэбіліся ў мірным жыцці. Маёнтак Шаўры стаў своеасаблівым выпрабавальным полем найбольш перадавых тэхналогій у цукраварстве, ткацтве, гарбарстве. А ў 1840 годзе наш вялікі суайчыннік стаў ініцыятарам закладкі вадалячэбніцы ў Друскеніках, сёння сусветнавядомым курорце ў Літве.

**Апавядальнік:** Навуковая дзейнасць Нарбута вельмі разнастайная. Ён вядомы як вучоны-прыродазнаўца.

Здолеў стварыць у сваім маёнтку ўнікальны збор кніг, старадрукаў і рукапісаў (каля 200 тамоў), меў багатую калекцыю археалагічных

матэрыялаў, якая нагадвала сучаснікам сапраўдны музей пад адкрытым небам.

Галоўным дасягненнем шматгадовай археалагічнай і збіральніцкай дзейнасці Т. Нарбута і яго паплечніка славутага прафесара Віленскага універсітэта У. Лялевеля трэба лічыць заснаванне ў 1855 годзе Віленскага музея старажытнасцяў, дзе было зарэгістравана 1,5 тысячы адзінак археалагічных матэрыялаў. Мастацкія палотны, творы дробнай пластыкі і выяўленчага мастацтва маглі б скласці самастойную галярэю. Нумізматычная калекцыя дасягала 3 тысяч грашовых знакаў.

Т. Нарбут не толькі даследваў родны край, але і друкаваў яскравыя і змястоўныя матэрыялы аб ім. Яго творы аб гісторыі Друскенік, Ліды, Навагрудка вельмі цікавілі чытачоў.

Менавіта Т. Нарбут увёў у навуковы ўжытак “Хроніку Быхаўца”, на якую і сёння вельмі часта спасылаюцца вучоныя-гісторыкі. Шмат жа крыніц з найбагацейшага збора вучонага так і засталося невядомым, бо пасля паўстання 1863 года ўся маёмасць поўнасцю знікла.

Заслужаны аўтарытэт Т. Нарбута выклікаў сімпатыі шматлікіх сучаснікаў. У яго Шаўрах пабывалі такія адметныя людзі, як Канстанцін і Яўстафій Тышкевічы, Адам Кіркор, якія адзначылі багацце хатняй калекцыі і багатыя веды самаго гаспадара. Ад Нарбута вялікі Адам Міцкевіч запазычыў легенду пра дзяды, якую выкарыстаў у аднайменнай сваёй паэме.

Пахаваны Т. Нарбут непадалёку ад родных Шаўраў, побач з парафіяльным касцёлам у Начы.

**Вядучы:** На прынёманскай зямліцы пачынаўся шлях многіх выдатных людзей, дзейнасць якіх трывала звязана з развіццём навукі не толькі Еўропы, але і іншых кантынентаў. Адзін з іх воляй лёсу быў закінуты ў Чылі….

**Апавядальнік:** Раніцай 23 мая 1884 года на вакзале Сант’яга, сталіцы Чылі, сабралася надзвычай шмат людзей. Шумна паводзілі сябе навучэнцы гімназіі, стрымана – студэнты ўніверсітэта. Паводаль ад натоўпа моладзі стаялі дэпутаты праламента, сенатары. А калі з’явіўся стары сівы мужчына, усе

рушылі да яго. Пачуліся крыкі : “Віват Дамейка!” Натоўп замёр ля вагона. Аркестр зайграў чылійскі нацыянальны гімн....

Такія ўрачыстыя провады былі арганізаваны нашаму земляку **Ігнату Дамейку**, які стаў Ганаровым грамадзянінам Чылі на дзесятым годзе знаходжання ў краіне.

Зараз прафесара праводзілі на Радзіму, у Беларусь, якую ён пакінуў пасля паражэння паўстання 1831 года. На тую Радзіму, дзе травы - самыя духмяныя, а дрэвы - самыя высачэзныя, дзе ў сонным царстве дзяцінства былі пакінуты калыбельныя песні маці і запаветныя мары.

Ігнат Дамейка нарадзіўся 31 ліпеня 1802 года ў весцы Мядзведка Навагрудскага павета у шляхецкай сям'і, якая паходзіла са старажытнага беларускага роду.

Так склаўся лёс, што Дамейка быў вымушаны пакінуць радзіму. Скончыўшы Каледж дэ Франс (Сарбона), паступіў ў Вышэйшую горную школу і ў канцы сакавіка 1837 года атрымаў дыплом горнага інжынера. У гэтым жа годзе Дамейка склаў геалагічную, гідраграфічную і гаспадарчую карты зямель былой Рэчы Паспалітай і напісаў геаграфічныя каментарыі да іх. Такім чынам, можна без перабольшвання лічыць Ігната Дамейку заснавальнікам фізіка-геаграфічнага раянавання Польшчы, Літвы і Беларусі.

У 1838 годзе малады інжынер нечакана атрымлівае прапанову ўрада Чылі заняць месца выкладчыка геалогіі і мінералогіі ў гімназіі г. Какімба. Падумаўшы, ён дае сваю згоду і ў хуткім часе плыве праз Атлантычны акіян у далёкую і невядомую яму краіну.

За тры месяцы наш зямляк авалодаў іспанскай мовай, распрацаваў арыгінальную методыку навучання, сутнасць якой - у практычным замацаванні ведаў. Ужо праз чатыры месяцы на публічным экзамене вучні паказалі, што дасканала ведаюць абсталяванне і прыборы лабараторыі.

Дамейка быў першым, хто распрацаваў і арганізаваў у краіне здабычу каменнага вуглю. Друкуюцца яго падручнікі “Трактат аб пробах” і

“Мінералогія”, якія пасля не адзін раз перавыдаваліся і ў іншых паўднёваамерыканскіх краінах.

Тры месяцы настаўнік з Какімба вандраваў па заселенай індэйцамі Араўканіі, вывучаючы побыт, звычаі, абрады і гісторыю гераічнага народа гэтай краіны. А пасля вяртання напісаў кнігу “Араўканія і яе жыхары”, якая захапіла свет!

Чатыры разы запар Дамейку  выбіралі рэктарам універсітэта у Сант'яга (з 1867 па 1883 г.г.). Такога поспеху не дасягаў ні адзін чужынец ні ў якай іншай краіне. І пакінуў гэту пасаду наш зямляк толькі для таго, каб мець больш часу на доследы.

46 гадоў жыцця беларускі шляхціц прысвяціў выхаванню і навучанню чылійскіх  геолагаў, мінеролагаў і дзяржаўных дзеячоў. Таму пасля прыняцця адстаўкі палата дэпутатаў парламента зацвердзіла яму пенсію ў 6000 піястраў штогод. Ніхто (нават генералы, якія змагаліся за незалежнасць Чылі) не быў так шчодра ўзнагароджаны!

Але ўсё часцей і больш узрастае неўтаймаваны сум па роднай старонцы….

**Апавядальнік**: І вось той вакзал, з якога пачынаўся наш апавед. Натоўп праважатых…Гукі гімна, прамовы ў гонар Дамейкі….

А праз пэўны час прагрукаталі колы цягніка па масту праз Буг. Радасна забілася сэрца: нарэшце  ён на радзімай зямліцы! Дамейка не мог заснуць усю ноч.

Вось яна, Уша - рачушка дзяцінства… І вось ужо коні нясуць яго да роднай хаты. У тую жнівеньскую раніцу 1884 года грамадзянін Чылі ўбачыў тое, аб чым марыў доўгае паўстагоддзе: залатыя палі жыта і пшаніцы, разнакаляровыя лугі ўздоўж Ушы, ізумрудна-зялёны лес. Увечары ён запіша ў сваім дзённіку: “На ўсё гэта глядзеў Міцкевіч, калі пісаў “Пана Тадэвуша”.

Амаль чатыры гады пражыў Ігнат Іпалітавіч на радзіме, вандруючы па мясцінах свайго дзяцінства і юнацтва. І толькі 15 лістапада 1888 года вярнуўся Дамейка ў Чылі. Але пажыць яму заставалася нядоўга. 23 студзеня

наступнага года ён памірае. Дзень яго смерці быў абвешчаны днём нацыянальнай жалобы.

**Апавядальнік**: Пасля смерці Ігнат Дамейка быў аб'яўлены нацыянальным героем Чылі. У Сант'яга ў 1902 годзе яму быў ўстаноўлены велічны помнік з надпісам “Вялікаму Асветніку”.

Імя І. Дамейкі занесена ў Спіс славутых людзей свету. 2002 год, у якім адзначалася 200-годдзе з дня нараджэння вучонага, па рашэнню ЮНЕСКА быў аб'яўлены годам Ігнація Дамейкі. У віншавальным пасланні Прэзідэнта Бедарусі да юбілейных урачыстасцяў нашага земляка адзначана: “Асоба Ігнація Дамейкі - яскравы прыклад любві да Беларусі і нястомнага навуковага пошуку”.

Vivat, Дамейка!

**Апавядальнік:** Менавіта Прынёманне дало жыццё філолагу-славісту, заснавальніку беларускага навуковага мовазнаўства, фалькларыстыкі і міфалогіі, стваральніку энцыклапедыі беларусазнаўства, этнографу **Яўхіму Карскаму**.

Упершыню глянуў на свет і падаў свой голас вялікі беларус 1 студзеня1861 года ў весачцы з ласкавай назвай Лаша.

Ураджвае аб’ём яго працы: сотні кніг, больш за 700 бліскучых артыкулаў - усё гэта трывала легла ў падмурак беларускай нацыі.

Найбуйнейшым навуковым дасягненнем Яўхіма Карскага стала ўсеабдымная праца “Беларусы”, роўнай якой, па прызнанню акадэміка Б.М. Ляпунова, не было ні ў аднаго славянскага народа. Па сутнасці, гэта была сапраўдная энцыклапедыя беларусаў.

На радзіме Карскага ў вёсачцы Лаша створаны музей навукоўцы, яго імем названы Гродзенская абласная бібліятэка і вуліца ў Гродне. У 1990 годзе урад Беларусі ўстанавіў 8 стыпендый імя Я. Карскага.

Карскі належыць да ліку тых навукоўцаў, чые працы ніколі не састарэюць, таму што адрозніваюцца багаццем фактычнага матэрыялу, змястоўнасцю і глыбінёй думкі. Ён – адзіны беларус, удастоены ў дарэвалюцыйны час

вышэйшага акадэмічнага звання ў філалогіі. А што яшчэ больш неверагодна, дык гэта тыя абставіны, што дысертацыйнае даследванне, за якое Я. Карскаму быў прысуджаны Вялікі залаты медаль, было напісана на мове беларусаў.

Нашчадкі, памятайце гэта імя!

**Апавядальнік:** Нельга не ўспомніць яшчэ аб адным вучоным з сусветным імем. Гаворка ідзе аб **Барысе Кіце**, які з дзядоў і прадзедаў сваіх паходзіў з вёскі Агароднікі Навагрудскага павета Карэліцкай воласці і, хаця і не нарадзіўся тут, але заўсёды, дзе б ні быў, імкнуўся на радзіму сваіх продкаў…

Пасля заканчэння фізіка-матэматычнага факультэта Віленскага універсітэта імя Стэфана Баторыя Барыс настаўнічаў у Віленскай беларускай гімназіі, быў дырэктарам Навагрудскай гімназіі, выкладаў у Баранавіцкім настаўніцкім інстытуце.

У 1944 годзе ад’яджае на Захад. Цяжка было пакідаць Радзіму, дзе было распачата столькі добрых спраў, дзе заставаліся яго вучні, родныя людзі ды часцінка яго душы. Але ж развітацца з настаўнікам прыйшла вялікая грамада яго выхаванцаў, каб выказаць вялікую падзяку і павагу чалавеку, які запаліў для іх святло ведаў, даў накірунак у жыццёвую дарогу.

Сёння наш зямляк з-пад Карэлічаў - акадэмік Міжнароднай Акадэміі Астранаўтыкі, заслужаны прафесар Мерылендскага універсітэта.

Барыс Кіт як акадэмік з міравым імем удастоены гонару быць занесеным у самые прэстыжныя навуковыя даведнікі свету: энцыклапедыю “Амерыканскія вучоныя”, біяграфічны даведнік “Брытанская каралеўская блакітная кніга”, слоўнік “Хто ёсць хто ў касманаўтыцы”. Біяграфія Барыса Кіта укладзена ў “капсулу часу”, якая знаходзіцца ў бібліятэцы Роберта Годарда ў Вашынгтоне .

У 1992 годзе вучоны перадаў сваю навуковую спадчыну ў Навагрудскі краязнаўчы музей. У 1994 годзе быў запрошаны ў Мінск на пасяджэнне Міжнароднай акадэміі Еўразіі і зноў наведаў сваю Бацькаўшчыну, родныя

мясціны: Мір, Карэлічы, Навагрудак, дзе яму быў уручаны Дыплом ганаровага грамадзяніна Навагрудка.

Памёр навуковец 1 лютага 2018 года на 108 годзе жыцця…

**Апавядальнік:** І, мабыць, - аб апошнім вучоным, бо пра яго не сказаць нельга. Гаворка пойдзе пра фізіка-тэарэтыка, прафесара Маскоўскага інжынерна- фізічнага інстытута, акадэміка Акадэміі навук СССР **Аркадзя Мігдала**.

Нарадзіўся будучы вучоны ў Лідзе 11 сакавіка 1911 года. Сваю прешую навуковую работу зрабіў у 17 гадоў, працуючы лабарантам у школе. Пасля заканчэння універсітэта і аспірантуры пачаў працаваць пад кіраўніцтвам аднаго з нямногіх у Савецкім Саюзе лаўрэатаў Нобелеўскай прэміі, геніяльнага акадэміка Льва Ландау. У гэтай працы ярка праявілася адна з найхарактэрнейшых рысаў нашага славутага земляка - імкненне і ўменне адшукаць якасна новы падыход ва ўмовах, калі стандартнае мышленне непрымальнае.

У 1945 годзе І. Курчатаў (заснавальнік савецкай атамнай энергетыкі) запрасіў Мігдала ў Інстытут атамнай энергіі. Менавіта тут былі напісаны навуковыя працы па квантавай тэорыі поля, фізіцы атамнага ядра і элементарных часціц.

Ключ да разумення жыцця і творчасці самаго акадэміка Мігдала закладзены ў выказванні фактычна забароненага ў савецкія часы філосафа Шапенгаўэра, якое вучоны ўзяў сабе за дэвіз жыцця: “Талент трапляе ў цэль, у якую ніхто трапіць не можа, геній трапляе ў цэль, якую ніхто не бачыць”. Таму да канца жыцця і ставіў перад сабой звышзадачы.

Для Мігдала жыццё і фізіка былі сінонімамі. Таму ён літаральна гарэў на працы. Мігдалам напісаны сотні навуковых артыкулаў, манаграфіі. Але самая славутая з іх “Тэорыя канчатковых фермі-сістэм і ўласцівасці атамных ядраў”, якая стала літаральна настольнай кнігай тэарэтыкаў - ядзершчыкаў усяго свету.

У снежні 1990 года вучоны паехаў у Амерыку, каб чытаць лекцыі ў знакамітым Прыстанскім універсітэце. Аднак адразу ж па прыезду адчуў сябе вельмі дрэнна. Папаўшы ў рукі дактароў, атрымаў дыягназ: запушчаны рак. І ўсё ж вучоны прачытаў свае лекцыі. І слухачы, і сам Мігдал ведалі ўжо, што дні яго злічаны. Але яго лекцыі, як заўсёды, дасціпныя, напоўненыя глыбокімі думкамі, рабілі настолькі ашаламляльнае ўражанне, што прымушалі думаць пра чарговую перамогу амерыканскай медыцыны. На жаль, перамогі не адбылося. Гэта была перамога Духу вялікага вучонага над хваробай, над смерцю.

Да свайго 80-годдзя вучоны не дажыў месяц і два дні….

Кажуць, што ў прозвішчах нашых заключаны наш лёс. Не ведаю, як у іншых, але з Мігдалам менавіта так. Па- старажытнаяўрэйску “Мігдал-эль” азначае “вежа Бога”. І памяць аб ім яшчэ доўга будзе ўзвышацца вежай у душах і памяці не аднаго дзесятка фізікаў-тэарэтыкаў, акадэмікаў, дактароў навук, якіх ён выхаваў. Не здарма ж у некралогу, які быў падпісаны вядучымі вучонымі краіны гаварылася: “Ён быў яркім і глыбокім папулярызатарам навукі. У сваёй кнізе “Пошукі ісціны” ён імкнуўся данесці да людзей, далёкіх ад навукі, яе сутнасць і прыгажосць. Яго філасофскія артыкулы, выступленні па тэлебачанню выклікалі жывы адгалосак у самай шырокай аўдыторыі. Яму былі ненавісныя таталітарызм і рабалепства. Менавіта таму ён не пабаяўся ўступіцца за Андрэя Сахарава ў перыяд горкаўскай ссылкі апошняга.

Усім сваім жыццём А.Б. Мігдал вучыў людзей, што былі побач з ім, жыць дастойна. След яго асобы застанецца ў думках і душах тых, каму пашчасціла ведаць яго”.

Вось такі чалавек нарадзіўся ў нашым горадзе!

**Вядучы**: Відаць, можна было б назваць яшчэ не аднаго ўраджэнца Прынямоння, імя якога пакінула ў навуцы яскравы след, але надыйшоў час перагортваць старонку нашага часопіса і пагаварыць аб культурным жыцці нашага краю.

Наступная старонка нашага альманаха – **“Культурная спадчына”**.

Без перабольшвання можна сказаць, што Прынёманне дало жыццё ці стала прытулкам першым ластаўкам беларускай літаратуры. Гэта і Ян Чачот, і Алаіза Пашкевіч, і Францішак Багушэвіч.

**Апавядальнік:** Але ж, пачаць трэба менавіта з **Яна Чачота**. Нарадзіўся Ян менавіта на свята Івана Купалы у в. Малюшыцы Навагрудскага павета.

Ён і не думаў пра тое, што калісьці будуць устанаўлівацца помнікі яму, а імя яго не згіне бясследна ў бездані часу, бо вуліцы будуць мець гонар ім называцца. Ён проста рабіў усё, што мог зрабіць для свайго народа.

Сваё прызванне Ян Чачот бачыў найперш у збіранні і вывучэнні беларускіх народных песень і таму з'ўляўся першай зоркай на небасхіле нацыянальнага адраджэння. І ў гэтым плане значэнне яго творчасці цяжка пераацаніць. Гэта досвітак беларускай літатратуры, яе першыя крокі.

Ян Чачот вядомы нам і як аўтар балад, вершаў і песень, заснаваных на беларускім фальклоры. Многія яго творы напісаны па-беларуску. У 1855 годзе Уладзіслаў Сыракомля ў адным са сваіх артыкулаў пісаў, што яму вядомы ўсяго два беларускія пісьменнікі, якія пішуць на мове свайго народа. Адзін з іх - Ян Чачот.

**Апавядальнік:** Край юности! Ты с нами до конца
Святой и чистый, словно первая любовь.

Гэтае прызнанне ў шчырай любві да Навагрудчыны належыць пяру нашага земляка, вялікага польскага паэта **Адама Міцкевіча**, імя якога ў сусветнай літаратуры стаіць побач з такімі імёнамі, як Шэллі, Байран, Кітс, Пушкін.

Вялікі Гётэ калісьці сказаў: “Той, хто хоча зразумець паэта, павінен ісці ў яго край”. У вернасці і мудрасці гэтых слоў пераконваешся, калі чытаеш бессмяротныя творы Міцкевіча.

Будучы паэт нарадзіўся ў маляўнічым кутку - маёнтку Завоссе, што на Навагрудчыне ў 1798 годзе.

Геній паэта ўвабраў у сябе шчодрую мудрасць і тонкі гумар беларускага народа, адвечны шум Налібокскай пушчы, непаўторную чароўнасць авеянага

легендамі і паданнямі возера Свіцязь і веліч павольнай плыні серабрыстага Нёмана. У душы паэтавай заўсёды жыла прыгажосць наварудскай зямлі, яе багатае гістарычнае мінулае, дзе кожны камень, кожны курган - сівая старажытнасць. І дзе б ні быў Адам Міцкевіч: ад Вільні да Пецярбурга, ад Бахчысарая да Канстанцінопаля - заўсёды ў думках сваіх вяртаўся на сваю Радзіму.

**Апавядальнік:** Неласкавы лёс судзіў паэту называць Беларусь Літвою. Але ніхто з вялікіх не сказаў пра родную мову прыгнечанага беларуса так, як сказаў Міцкевіч з еўрапейскай трыбуны, назваўшы яе “самай багатай і чыстай, самай гарманічнай з усіх усходнеславянскіх моў, адзначанай узвышанай прастатою”. І менавіта польскі паэт Адам Міцкевіч гаварыў, што няма людзей больш сумленных і высакародных, чым беларускія сяляне.

У сваіх шматлікіх баладах, паэмах Міцкевіч апавяў прыгажосць роднага краю, мужнасць людзей, што тут жылі.

**Апавядальнік:** Апошнім творам, які быў напісаны Міцкевічам на радзіме, была паэма “Дзяды”. Перагарніце старонкі гэтага твора - якія родныя прозвішчы, якія блізкія назвы! Здаецца, гэта было напісана ўчора і менавіта пра нашых дзядоў….

Набліжаўся 1823 год, які прынёс Міцкевічу і яго сябрам шмат пакут і страт. Паэт быў вымушаны пакінуць радзіму.

За доўгія гады выгнання Міцкевіч аб’ехаў амаль усю Еўропу, сустракаўся з вядомымі людзьмі, сярод якіх былі Шапэн, Жорж Санд, Гогаль, Агінскі, Пушкін і інш. Але нідзе не пакідала яго туга аб радзіме, і горка рыдаў ён, слухаючы сумные творы свайго суайчынніка - кампазітара Шапэна.

**Апавядальнік:** Пад час руска-турэцкай вайны Міцкевіч едзе ў Канстанцінопаль. Але па дарозе ён захварэў і 26 снежня 1855 года памёр.

З неўміручай любові да навагрудчыны, яе народа, яе гісторыі і сціплай, але непаўторнай прыроды, нарадзілася ўсё самае цудоўнае з-пад пяра вялікага паэта. Ад першых юнацкіх балад і рамансаў да мужнай і велічнай плыні

“Пана Тадэвуша” - усюды жыве  прыгажосць роднага краю, тонка і проста заключаная ў звонкае паэтычнае  слова.

**Апавядальнік:** На адной з цантральных вуліц Гродна ўзвышаецца помнік выдатнай польскай пісьменніцы **Элізе Ажэшка**, якую ўкраінскі пісьменнік Іван Франко назваў “зоркай першай велічыні” на гарызонце польскай літаратуры мяжы  XIX-XX  стагоддзяў.

Нарадзілася будучая пісьменніца ў вёсцы Мількаўшчына, непадалёку ад Гродна, 6 чэрвеня 1842 года ў сям’і вальнадумца Бенядзікта Паўлоўскага, што пахадзіла са старажытнага шляхецкага роду.

Эліза Ажэшка пакінула вялікую творую спадчыну - каля 60 тамоў мастацкай прозы, крытыкі і публіцыстыкі. Сучаснікі нездарма называлі Элізу “жывой мудрасцю і чуйным сэрцам цэлай эпохі”. Працягваючы вялікія традыцыі Міцкевіча, пісьменніца, як ніхто да яе ў польскай літаратуры, заглянула  ў хату беларускага селяніна і з жахам і сумам паведала суровую праўду аб яго самотным жыцці і горкай долі, аб яго пакутным лёсе.

Найвялікшую славу і поспех пісьменніцы прынеслі творы, прысвечаныя жыццю беларускай вёскі,   “Нізіны"”, “Хам”,  “У зімні вечар” і інш.

Шчырая цікавасць да сялянскага жыцця, звычаяў беларускага народа знайшла сваё адлюстраванне  і на старонках краязнаўчага нарыса “Людзі і кветкі над Нёманам”.  У гэтай працы Эліза Ажэшка шырока выкарыстоўвала паданні і легенды, казкі і песні, з сімпатыяй і любоўю апісваючы побыт беларускіх сялян, іх маральныя прынцыпы і светапогляд, асобным раздзелам падала прыказкі і прымаўкі.

Трэба нагадаць, што  творы Элізы  вылучаліся на атрыманне Нобелеўскай прэміі, аднак перавага была аддадзена гістарычным раманам Генрыка Сянкевіча.

На працягу свайго жыцця Эліза імкнулася да справядлівасці, дапамагала знаёмым і незнаёмым людзям у бядзе. Народ з любоўю і ўдзячнасцю адносіўся да сваёй заступніцы. Аб гэтым сведчыць і той факт, што, калі хворая Эліза ляжала на смяротным одры, усе вуліцы і завулкі, усе маставыя

вакол яе хаты былі ўсланыя трапяткімі рукамі людзей насеннем, каб павозкі, якія праязджалі міма, не парушалі спакой паміраючай жанчыны.

Памерла Эліза Ажэшка 18 мая 1910 года.

**Вядучы:** “Каралевай жывога слова і прыгнечанай праўды” назваў Элізу Ажэшка беларускі паэт **Францішак Багушэвіч**, які нарадзіўся ў маёнтку Свіраны. Калі Францішку споўнілася 6 гадоў, сям'я пераехала на Ашмяншчыну, у фальварак Кушляны, дзе прайшло дзяцінства будучага паэта і дзе сёння адкрыты музей.

Менавіта нашаму земляку належаць вялікія словы: “Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, … а потым і зусім змёрлі… Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмерлі!”.

**Вядучы:** Імем Багушэвіча ў літаратуры адкрываецца цэлае пакаленне дэмакратычных пісьменнікаў Беларусі, да ліку якіх належыць і наша зямлячка **Алаіза Пашкевіч (Цётка).**

Алаіза нарадзілася ў фальвараку Пешчын Лідскага павета. Родныя мясціны, дзе прайшло дзяцінства і юнацтва Алаізы, пакінулі ў яе сэрцы велізарную любоў не толькі да беларускай прыроды, але і да простых і працавітых сялянскіх людзей, сярод якіх яна расла і была сведкам іх нялёгкага жыцця. Менавіта гэтае жыццё і стала аб'ектам адлюстравання ў творчасці паэткі.

Алаіза Пашкевіч удзяляла вялікую ўвагу вывучэнню і веданню роднай мовы беларусаў і заклікала інтэлігенцыю размаўляць з беларускім народам на яго роднай мове. Яе пяру належыць артыкул “Шануйце роднае слова” у якім яна высока ацэньвае прыгажосць і веліч беларускай мовы, і падручнік-хрэстаматыя “Першае чытанне для дзетак-беларусаў”.

Творчасць Цёткі, яе літаратурная і грамадская дзейнасць з’яўляецца прыкладам грамадзянскай самаадданасці і высакароднага служэння Радзіме і народу. Лепшыя творы паэткі перакладзены на рускую, украінскую, польскую, нямецкую і іншыя мовы народаў свету.

Не згінай мяне, я не сагнуся,

Не баюся ні страху, ні зла.
Нездарма я з зямлі беларускай
Непахіснай сасной ўзрасла.

**Апавядальнік:** Творчасць яе моцна паўплывала на погляды беларускай творчай інтэлігенцыі, у тым ліку і паэтэсы **Данута Бічэль**, якая нарадзілася ў вёсцы Біскупцы, што пад Лідай. Менавіта Прынёманская зямля натхніла Дануту на напісанне сваіх першых вершаў. Ды й сапраўды, не магла яна не сесці за пяро, бо мясціна яе нараджэння вельмі незвычайная. Вось як сама паэтка піша аб гэтым: "Зусім недалёка ад Ліды, у фальварку Пешчын, нарадзілася Алаіза Пашкевіч. З другога боку, за Нёманам, вырас Адам Міцкевіч…

А яшчэ недалёка Нача, дзе нарадзіўся акадэмік Марыян Фальскі, аўтар першага беларусакга лемантара…. А каля Уселюба малая вёсачка Устронь, адкуль паходзіла першая паэтка нашай зямлі Адэля, аўтарка паэмы "Мачаха". Мае вершы жывіліся ўсім гэтым…"

І гэта вельмі ачуваецца, калі чытаеш радкі:

Я на раздарожжы не зблуджуся
і не збочу, каб чакаць падмогі.
Па шляхах зялёных Беларусі
буду пракладаць свае дарогі.

Ад роднае зямлі, ад яе бяздонных крыніц і блакітных рэк, ад палёў, распісаных золатам жыта і шчырай народнай песні бярэ свае вытокі паэзія Данута Бічэль, нашай зямлячкі.

**Вядучы:** У беларускай літаратуры няшмат празаікаў, якія б раскрывалі ў сваіх творах далёкую і блізкую гісторыю нашай Радзімы. А такія творы вельмі неабходны сёняшняй моладзі, бо яны не толькі інфармуюць пра тое, якой яркай і насычанай, трагічнай і балючай была наша нацыянальная гісторыя, але выхоўваюць пачуцці патрыятызму, чалавечай годнасці і гонару за свой край, за свой народ.

**Апавядальнік:** У гэтым абуджэнні добрых пачуццяў немалая заслуга нашай землячкі **Вольгі Іпатавай**, якая нарадзілася ў першы дзень пераможнага 1945 года у гарадскім пасёлку Мір, Карэліцкага раёна.

Пісьменніца ў сваёй творчасці змагла красамоўна і глыбока напісаць аб мінулым нашай Радзімы, аб глыбінных плынях жыцця народа і яго найбольш яркіх і таленавітых прадстаўніках, стварыўшых духоўную гісторыю нацыі.

Творчасць Вольгі Іпатавай вельмі цесна пераклікаецца з традыцыямі, што ідуць ад Янкі Маўра і Уладзіміра Караткевіча. Менавіта праз Караткевіча прыйшло да пісьменніцы захапленне гісторыяй, бо, як піша яна сама, творы класіка беларускай гістарычнай прозы Уладзіміра Караткевіча "абудзілі жаданне як мага больш ведаць гісторыю сваёй зямлі".

Вольга Іпатава і ў паэзіі, і ў прозе мае свой выразны і толькі ёй характэрны мастацкі стыль.

Менавіта таму ў 1995 г. пісьменніца была абрана Ганаровым акадэмікам Міжнароднай Акадэміі навук Еўразіі, якая аб'ядноўвае навукоўцаў і грамадскіх дзеячоў больш 30 краінаў свету. Яна ўзнагароджана медалём Францыска Скарыны, ордэнам "Знак Пашаны".

**Вядучы** *(на фоне гучання "Паланеза Агінскага")*: Наўрад ці убачыш раўнадушныя твары, калі гучыць паланез "Развітанне з Радзімай", аўтарам якога з'яўляецца кампазітар **Міхал Клеафас Агінскі**.

Здаецца, што ўсе складаныя пачуцці ўнутранага свету чалавека перапляліся ў гэтай элегічнай і ў той жа час напоўненай аптымізмам чуллівай мелодыі.

Паланез Агінскага - любімы твор многіх людзей празнага ўзросту. Без яго нельга ўявіць еўрапейскую музычную культуру. Ён упершыню загучаў на пачатку XIX стагоддзя на прыдворных балях і музычных вечарынах і назаўсёды застаўся ў рэпертуары не толькі класічных музыкантаў, але і рок-выканаўцаў.

Выдатныя творы мы часта звязваем з мясцінамі жыцця і творчасці іх стваральнікаў. Нам бясконца дарагія Вязынка Купалы, Ракуцёўшчына Багдановіча, Мікалаеўшчына Коласа…

Залессе, вёсачка на Смаргоншчыне, мае самае непасрэднае дачыненне да вядомага паланеза. Яна не была радзімай Агінскага, калі мець на ўвазе месца нараджэння, але яна стала для яго самым любімым і дарагім куточкам на зямлі.

**Апавядальнік**: ….У канцы 1822 года Міхал Агінскі апошні раз пройдзецца па любімаму маршруту - да Віліі, абыйдзе свой непаўторны парк, надоўга затрымаецца ля памятнага камня ў гонар Касцюшкі... Менавіта у тыя дні па меркаванню даследчыкаў і быў напісаны паланез а- moll №13, вядомы большасці з нас як "Развітанне з Радзімай".

Міхала Агінскага чакала прыдарожная карэта…

**Апавядальнік**: Што ведаем мы, сёняшнія, пра жыццё Агінскага? Вельмі і вельмі мала.

Лёс склаўся такім чынам, што на Радзіме яго ўзгадваюць як аўтара аднаго твора. А між іншым, яго пяру належыць 40 фартэпіянных п'ес: паланезы, вальсы, мазуркі, маршы, кадрылі. У спадчыну кампазітара ўваходзяць 18 вакальных твораў: рамансы, песні, опера.

Зборнікі кампазітара з Залесся выдаваліся ў Пецярбургу і Берліне, Парыжы і Вене, Лондане і Філадэльфіі, Вільне і Варшаве, Дрэздэне і Мілане і прынеслі нашаму суайчынніку сусветную вядомасць.

Памяць удзячных нашчадкаў аб вялікім музыке ўвасоблена ў мемарыяльнай дошцы, створанай Валер'янам Янушкевічам, якая ўсталявана на сцяне старажытнага кляштара Сантэ Крочэ, дзе пахаваны прах кампазітара, у мастацкай стужцы рэжысёра Льва Голуба "Паланез Агінскага" і ў эсэ Уладзіміра Караткевіча "Песні Паўночных Афінаў" і ў нашых душах…

**Вядучы:** У 1859 годдзе ў Лідзе нарадзіўся Канстанцін Горскі, скрыпач, кампазітар, педагог, аўтар оперы "Маргер" (паводле твораў У. Сыракомлі),

сімфанічных паэм, рамансаў  і п’ес. Пры гэтым Канстанцін Горскі заставаўся любімым публікай скрыпачом і лічыўся сярод  кампазітараў выдатным інтэрпрэтатарам іх твораў. Вялікую павагу выказваў  Пётр Ільіч Чайкоўскі, лічачы К. Горскага адным з лепшых выканаўцаў свайго скрыпічнага канцэрта D-dur № 1.

З 1995 года штогод ладзіцца конкурс  імя К. Горскага, у якім бяруць удзел юныя музыкі Прынёмання.

**Вядучы:** Музычнае жыццё свету захавала ў памяці і данесла да нас імя выдатнага  кампазітара, знакамітага спевака,  якога лічылі  голасам пакалення канца  60-х -  90-х гадоў і зоркай сусветнай велічыні XX стагоддзя **Чэслава Немана.**

**Апавядальнік:** Чэслаў нарадзіўся  і вырас у Старых Васілішках, што на Шчучыншчыне. У 1958 годзе  сямь’я будучага спевага пераехала ў Польшчу, дзе і ракрыўся талент музыканта. Але менавіта назву роднай з дзяцінства ракі Нёман Чэслаў узяў у якасці творчага псеўданіма.

Некалі за яго пласцінкамі выстраіваліся велізарныя чэргі, кожнае выступленне  і вельмі незвычайны голас выклікалі буру  пачуццяў. Па колькасці залатых дыскаў Неман мог паспаборнічаць з вядомай на ўвесь свет англійскай групай "The Beatles". Спавяк  неаднаразова падымаў з месцаў захопленых яго музыкай слухачоў  знакамітай парыжскай “Алімпіі”  і прымусіў гаварыць і спрачацца аб сабе цэлы свет!

**Апавядальнік**: Ёсць на карце Лідчыны, у Дзітвянскім сельсавеце, невялікая вёсачка – Банцавічы. Менавіта адсюль у вялікі  свет народнай песні  пайшла будучая  заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь **Ганна Радзько**.

**Апавядальнік:** У Лідзе нарадзіўся **Беларускі музыкант, кампазітар, фальклярыст, пісьменнік, выкладчык культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў,  аўтар шматлікіх  праграм для навучэнцаў і студэнтаў,** нязменны лідар  вядомага этнагурта “Тройца” **Іван Кірчук.**  Гэты

незвычайны і самабытны музыкальны калектыў, які выконвае фолк-ф'южн музыку, вядомы не толькі ў Беларусі, але (бадай, што больш) і далёка за яе межамі.

Удзельнікі групы "Тройца" напісалі музыку да мастацкіх кіналентаў "Маленькія ўцекачы", "Тры талеры" і "Цень самурая".

**Стыль і глыбокае веданне народнай спадчыны Івана Кірчука ўражваюць і захапляюць слухачоў розных пакаленняў.**

**Апавядальнік:** У культурным жыцці краіны пакінуў свае адбіткі **Рычард Смольскі** - доктар мастацтвазнаўчых навук, педагог, рэктар Акадэміі мастацтваў Рэспублікі Беларусь. Смольскі - аўтар радыёп'ес і п'ес для тэатра, сцэнарыяў дакументальных фільмаў, кніг і манаграфій аб гісторыі беларускага тэатра і кіно, у тым ліку і акадэмічнага выдання "Гісторыя беларускага тэатра".

Нарадзіўся Р. Смольскі 3 красавіка 1946 года ў Лідзе.

**Апавядальнік:** У горадзе Ліда нарадзілася польская артыска **Поля Ракса**, вядомая гледачу па фільмах "Дзяўчына ля вакна", "Накцюрн", "Попел", Але асабліва запомнілася яна савецкаму гледачу ў фільме "Чатыры танкісты і сабака".

**Апавядальнік**: 4 мая 1958 года ў нашым горадзе нарадзіўся **Андрэй Бубашкін**, які таксама прысвяціў сваё жыццё кіно і тэатру.

Пасля заканчэння Усесаюзнага дзяржаўнага інстытута кінамастацтва, дзе вучыўся ў майстэрні народнага артыста СССР А. Баталава, А. Бубашкін працаваў на студыі "Беларусьфільм". Здымаўся ў многіх мастацкіх стужках, найбольш запамінальнымі з якіх можна назваць "Пераправа", "Плач перапёлкі", "Пакутнік", "Чорны квадрат", "Мёд асы" і інш.

Неверагодны поспех меў спектакль аднаго акцёра "Сон смешнага чалавека" па творах Дастаеўскага, ў якім адзіную і галоўную ролю сыграў наш зямляк. На міжнародным фестывале ў 1996 годзе гэты мона-спектакль быў адзначаны спецыяльным прызам "Хрустальны яблык".

Менавіта з гэтым творам Андрэй Бубашкін цэлы месяц у 1999 годзе гастраляваў па Германіі. Але па дарозе на радзіму, на жаль, знік без вестак….

**Вядучы**: Пакінулі свой след нашы землякі і ў сусветным **выяўленчым мастацтве** .

**Апавядальнік:** Развіццё гістарычнага жанру ў мастацтве Еўропы XIX стагоддзя звязана з імем **Януара Сухадольскага**, які зрабіў значны ўклад у гісторыю выяўленчага мастацтва беларускага, рускага, польскага і літоўскага народаў.

Першы буйны поспех выпаў на долю жывапісца падчас наведвання Мікалаем I Варшавы. Для імператара была наладжана мастацкая выстава, на якой і эспанавалася карціна Сухадольскага "Смерць Варненчыка". Палатно так спадабалася цару, што ён пажадаў набыць яго. Сухадольскі падараваў сваю карціну Мікалаю, за што быў узнагароджаны залатой табакеркай.

У карцінах Сухадольскага дакументальная дакладнасць адлюстравання спалучаецца з выдатна распрацаванай кампазіцыяй, яркай маляўнічасцю жывапісных вырашэнняў і незвычайным рамантызмам.

Найбольш вядомыя карціны мастака, якія з'яўляюцца хрэстаматыйнымі, - "Узяцце Ачакава", напісаная ў 1853 годзе і набытая Пецярбургскай Акадэміяй мастацтваў, і "Пераход Напалеона праз Бярэзіну", якая зараз захоўваецца ў Нацыянальным музее ў Познані.

Творчасць нашага земляка сугучна творчасці рускага баталіста Верашчагіна.

**Апавядальнік:** Адным з найбольш вядомых гістарычных жывапісцаў другой палавіны XIX стагоддзя быў **Казімір Альхімовіч**. Нарадзіўся будучы мастак у вёске Дэмбрава былога Лідскага павета Гродзенскай губерніі ў сям'і небагатага беларускага шляхціча.

Альхімовіч - майстар глыбока эмацыянальнага псіхалагічнага жывапісу. Сюжэты для сваіх палотнаў мастак чэрпаў з гісторыі, калі лёс беларускага і літоўскага народаў быў агульным. Асаблівую цікавасць мае карціна

“Пахаванне Гедэміна”. Палатно атрымала сусветную вядомасць, экспанавалася на выставах у Варшаве, Пецярбургу, Сан-Францыска, дзе было ўдастоена вышэйшых узнагарод.

Плённа займаўся К. Альхімовіч і графікай. Па матывах творчасці Адама Міцкевіча мастак стварыў шэраг карцін да паэмы “Пан Тадэвуш”.

Пакінуў след наш зямляк і на сценах касцёла Святой Кацярыны ў Пецярбургу, роспісам якога займаўся разам з іншымі мастакамі.

**Вядучы:** Ну, вось і надыйшоў час перагарнуць апошнюю старонку нашага альманаха.

Якая прыгожая Прынёманская зямля! З Нёманам звязана і сівая даўніна нашага краю і яго сёняшні светлы дзень. Без ракі гэтай не было б ні нашых песень, ні нашага хлеба…

**Вядучы:** У мерапрыемстве прагучалі імёны людзей, якія сталі культавымі для пэўных часоў і эпох. Колькі яшчэ неспазнаных таямніц, нечаканых загадак утоўвае наша зямля… Знаходзьце іх, спасцігайце іх!

**Вядучы:** Апошняя старонка нашага альманха, якая называецца “Мы - нашчадкі”, мае зусім не шмат радкоў. Доўжыць яе – вам! Бо гісторыя нашай Радзімы і Прынёманскага краю яшчэ чакае сваіх адкрывацеляў. І, пэўна, нехта з прысутнічых мог бы стаць першапраходцам шматлікіх тайн, знаходак і імёнаў. А нехта і сам упіша сваё імя ў Гісторыю…

Будзем жа вартыя гістарычнай памяці нашай Радзімы!

У добры шлях!

## Выкарыстаная літаратура:


1. Булахов, М. Евфимий Фёдорович Карский : жизнь, научная и общественная деятельность / Под ред. В. Борковского. - Минск, БГУ, 1981. - 271с. : ил.
2. Вучоны з сусветным імем // Сыны і пасынкі Беларусі / С. Барыс, С. Тарасаў, Г. Ланеўскі і інш. - Мінск: Полымя, 1996. - С. 375-413

3. Дубровский, В. Казимир Нарбут / Под ред. С. Подокшина . – Минск : Наука и техника, 1979. - 136 с.
4. Ненадавец, А. Тэадор Нарбут / А. Ненадавец. – Мінск : Полымя, 1996. - 63 с. ил (Нашы славутыя землякі)
5. Савік, Л. Беларусь! Твая дачка я // Іпатава, В. Прадыслава: аповесці і апавяданні. - Мінск, 1997. - С.3-10